УДК 619(092)
**МЯТЛІЦКАЯ Д.А.**, студэнт
Навуковы кіраўнік **КУРДЗЕКА Ж.П.**, ст. выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# ВЫДАТНЫ ДЗЕЯЧ ВЕТЭРЫНАРНАЙ НАВУКІ МАКАРЭЎСКІ АЛЯКСЕЙ МІКАЛАВІЧ

У 2017 годзе адзначаецца 90 гадоў вядучым кафедрам Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны – унутранных незаразных хвароб і клінічнай дыягностыкі. Значную ролю ў развіцці дадзеных структур адыграў знакаміты вучоны ў галіне ветэрынарыі – Макарэўскі Аляксей Мікалавіч (1863 – 1942).

Ён нарадзіўся ў Смаленскай губерніі ў сям'і беднага народнага настаўніка. Заўсёды Макарэўскага прыцягвала сялянства. Яшчэ будучы студэнтам Смаленскай духоўнай семінарыі, задумаў прысвяціць сябе «служэнню народу», але ў якасці ветэрынарнага ўрача. У 1882 г. паступае ў Харкаўскі ветэрынарны інстытут. Макарэўскі захапляецца рэвалюцыйнай працай, за гэта яго неаднаразова арыштоўвалі, нават сядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці.

З 1901 г. пачынаецца яго ветэрынарная і грамадская дзейнасць: прадае ветэрынарныя выданні ў інстытуце, арганізоўвае бюро студэнцкіх ветэрынарных выданняў, прымае ўдзел ў аднаўленні студэнцкай бібліятэкі-чытальні. Пасля заканчэння інстытута ў 1904 г. Макарэўскі са званнем ветэрынарнага ўрача назначаецца ў Томскую губернію, дзе з'яўляецца піянерам прышчэпак супраць запалення лёгкіх у рагатай жывёлы і ў выніку займае пачэснае месца сярод ветэрынарных урачоў.

У 1907 – 1908 гг. Макарэўскі арганізоўвае з'езды ветэрынарных урачоў і фельчараў Табольскай губерніі, якія былі вялікім наватарствам і нідзе ў тыя часы не паўтараліся. З 1908 г. пачынаецца сур'ёзная навуковая праца. Яго магістарская дысертацыя «Павальнае запаленне лёгкіх рагатай жывёлы ў Азіяцкай Расіі» зацікавіла замежную прэсу, вынікам чаго з'явіўся яе пераклад на англійскую мову па заказу з Аўстраліі. У 1916 г. абараняе дысертацыю на ступень магістра ветэрынарных навук. У 1920 г. зацвярджаецца прафесарам Харкаўскага ветэрынарнага інстытута.

У верасні 1925 г. прафесар Макарэўскі пераводзіцца ў Беларускі ветэрынарны інстытут на кафедру дыягностыкі ўнутраных хвароб хатняй жывёлы, а з 1926 – 1927 гг. займае кафедру прыватнай паталогіі і тэрапіі ўнутраных хвароб хатняй жывёлы, а таксама агульнай тэрапіі. З 1925 г. выбіраецца старшынёй Бюро секцыі навуковых работнікаў Віцебшчыны, а таксама членам савета цэнтральнай Беларускай секцыі навуковых работнікаў.

Навуковыя працы прафесара Макарэўскага А. М. маюць вялікую каштоўнасць. Ім надрукавана больш за 500 розных артыкулаў, адрэдагаваны цэлы шэраг асобных кніг і брашур.

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ